# АДУКАЦЫЙНАЕ ПАДАРОЖЖА Ў ПРАГУ

**Мікалай Запрудзкі**

На працягу пяці дзён беларуская група работнікаў адукацыі мела сустрэчы ў Міністэрстве школаў моладзі й спорту з дарадцам Міністра, з намесьнікам дырэктара НДШ пэдагогікі. Мы наведалі Карлаў унівэрсітэт, цэнтры падвышэньня кваліфікацыі работнікаў адукацыі, цэнтры падрыхтоўкі мэнэджэраў адукацыі й падвышэньня кваліфікацыі настаўнікаў АСІС, мультыкультурнай адукацыі «Варыянты», інтэграцыі ў чэскае грамадства прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў «Новая школа», дзьве базавыя школы й інш.

Асабліва хвалюючым было наведваньне у Празе мясьцінаў, якія зьвязаныя зь Беларусьсю, і ўдзел ва ўрачыстй падзеі ўручэньня В. Гавелам прэміі «Нашай ніве».

Сустрэчы з работнікамі адукацыі рознага роўню, наведваньне ўстановаў адукацыі, вывучэньне «Белай кнігі» дазваляюць зрабіць высновы пра тое, што для адукацыі Чэхіі ў апошнія гады характэрнымі зьяўляюцца наступныя рысы:

- сыстэмнасць працэсаў рэфармаваньня;
- дэцэнтралізацыя кіраваньня;
- дэідэалагізацыя адукацыі;
- уключэньне ў зьмест адукацыі ключавых кампетэнцыяў;
- экспэрыментальная апрабацыя новаўвядзеньняў (55 школаў, якія рэформу пачалі на некалькі гадоў раней за іншых);
- школы самі ствараюць навучальныя пляны, у якіх ёсць дзяржаўны кампанэнт, інспэктары правяраюць выкананьне школамі плянаў;
- усе базавыя школы зьяўляюцца муніцыпальнымі, усе школы – юрыдычныя асобы;
- вялікая ўвага надаецца гісторыі й культуры сваей краіны,
  кампутарызацыі школ, абменам вучняў са школамі замежжа;
- падвышэньнем кваліфікацыі займаюцца 14 рэгіянальных цэнтраў (яны, у асноўным, выконваюць арганізацыйныя функцыі), пэдагагічныя факультэты унівэрсітэтаў (зрэдку) і мноства недзяржаўных арганізацыяў. Усе яны праходзяць адпаведную акрэдытацыю ў Міністэрстве адукацыі.

Асноўным дакумэнтам, які носіць рамачны характар і вызначае стратэгію, шляхі й сродкі ажыцьцяўленьня рэформы, зьяўляецца «Белая кніга». Яе аўтары – супрацоўнікі Міністэрства адукацыі, НДІ педагогікі, дырэктары школаў і прадстаўнікі грамадскіх арганізацыяў.

На падставе гэтай кнігі падрыхтаваны новы закон аб адукацыі.

У **першай главе** «Белай кнігі» вызначаныя й тлумачацца мэты адукацыйнай сыстэмы краіны:

- разьвіцьцё чалавечай індывідуальнасьці;
- перадача гістарычна ўзніклай культуры грамадства;
- выхаваньне асобы ў духу аховы навакольнага асяродзьдзя;
- узмацьненьне кансалідацыі грамадства;
- падтрымка дэмакратыі й грамадзянскай супольнасьці;
- выхаваньне партнэрства, супрацоўніцтва й салідарнасьці з эўрапейскай і глябальнай супольнасьцю;
- павелічэньне канкурэнтнай здольнасьці эканомікі й пасьпяховага разьвіцьця грамадства;
- павелічэньне занятасьці.

У **другой главе** дадзеная характарыстыка зьменаў у грамадстве й іх вынікаў. Выкладзеная канцэпцыя «Бесьперапынная адукацыя для ўсіх”, пададзеныя прынцыпы дэмакратычнай адукацыйнай палітыкі, прадстаўленыя стратэгічныя кірункі адукацыйнае палітыкі ў Чэскай Рэспубліцы:

- задаволіць адукацыйныя патрэбы дзяцей, моладзі й дарослых;

- дасягнуць новай якасьці й функцыянальнасьці адукацыі;
- дабудаваць сыстэму ацэнкі дзейнасьці адукацыйных інстытутаў;
- разьвіваць аўтаномію, інавацыйны патэнцыял і матэрыяльную базу школаў, іх адкрытасьць да грамадства;
- падтрымліваць зьмены ў разуменьні эфэктыўнасьці пэдагагічнай дзейнасьці ва ўсіх адукацыйных інстытуцыях;
- увесьці ў грамадскую практыку дэцэнтралізаванае рэгуляваньне адукацыйнай сфэры з дапамогай дзяржаўных органаў, органаў самакіраваньня й сацыяльнага партнэрства.

У гэтай жа главе названыя адкрытыя пытаньні й рызыкі пры рэалізацыі рэформы.

У **трэцяй главе** прадстаўлены кіраваньне й фінансаваньне адукацыйнай сыстэмы ў новых умовах. Тут ідзе размова пра задачы цэнтру, а таксама ніжніх узроўняў кіраваньня, пра прынцыпы фінансаваньня. Вызначаныя прыярытэты фінансавай палітыкі.

**Чацьвертая глава.** Тут дадзены дэмаграфічны й эканамічны прагноз развіцьця адукацыйнае сыстэмы.

У **пятай главе** пададзена апісаньне эўрапейскага й міжнароднага супрацоўніцтва ў адукацыі: з Эўрапейскім зьвязам, арганізацыяй па гаспадарчаму супрацоўніцтву й разьвіцьцю, Радай Эўропы, ААН, ЮНЭСКА. Названыя праекты рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Падаецца карысным і цікавым параўнаць тыя адметнасьці й тэндэнцыі, якія праяўляюць сябе ў адукацыйных сыстэмах Беларусі й Чэхіі:

| Пазыцыі для параўнаньня | Беларусь | Чэхія |
|---|---|---|
| Нарматыўная база функцыянаваньня адукацыі й яе рэформы | Даволі поўна й дэталёва рэгламентуе дзейнасьць адукацыйнае сфэры, адукацыйных інстытутаў і суб'ектаў. | Закон аб адукацыі і дзяржаўна-грамадскі дакумэнт “Белая кніга” рамачна вызначаюць прыярытэты развіцьця адукацыі. Асабліва значнае мейсца займае сувязь адукацыі краіны з адукацыяй у Эўропе. |
| База экспэрыменту па рэформе | 19 сярэдніх школаў | 55 сярэдніх і базавых школаў |
| Сыстэмы кіраваньня адукацыяй | Узрастае цэнтралізацыя ў кіраваньні; установы адукацыі амаль ня маюць аўтаноміі; рэдкія зь іх маюць статус юрыдычнай асобы. (Дзеля справядлівасьці адзначым, што праект закону аб агульнай сярэдняй адукацыі ўводзіць норму, што ўсе школы – юрыдычныя асобы). | Праяўляюць сябе тэндынцыі дэцэнтралізацыі; адукацыйныя ўстановы (асабліва ўнiверсітэты) маюць вялікую самастойнасьць. Усе ўстановы ёсьць юрыдычнымі асобамі. |
| Ідэалёгія ў навучальных установах | Узмацняецца ідэалягізацыя й палітызацыя дзейнасьці й зьместу адукацыі; прыярытэтным ёсьць ськіраванасьць на безальтэрнатыўнасьць поглядаў суб'ектаў навучальна-выхаваўчага працэсу. | Адбываецца дэідэлягізацыя й дэпалітызацыя навучальных установаў. |
| Узбуйненьне школаў | Адбываецца за кошт ліквідацыі малакамплектных | Адбываецца за кошт ліквідацыі малакамплектных школаў; |

| | | |
|---|---|---|
| | школаў; мясцовыя органы імкнуцца выканаць устаноўкі па ліквідацыі малых школаў. | мясцовыя органы супрацьдзейнічаюць аптымізацыі сеткі школаў. |
| Зьмест адукацыі | Міністэрства вызначае базавы кампанент зьместу адукацыі (каля 85%), астатняе – сама школа<br>Дамінуе ўяўленьне пра зьмест адукацыі як суму ведаў і прадметных уменьняў. | Міністэрства вызначае мінімальную колькасьць прадметаў і дае вялікую самастойнасьць школе.<br>Пашыраецца за кошт уключэньня ў зьмет адукацыі ключавых кампетэнцыяў. |
| Тэхналёгіі й мэтады навучаньня | Дамінуе камбінаваны ўрок з тлумачальна-ілюстратыўнымі мэтадамі навучаньня. | Шырока прымяняюцца актыўныя мэтады навучаньня. |
| Кампутарызацыя навучаньня | Пашыраецца, але значная частка гарадскіх школаў і амаль усе вясковыя ня маюць сучаснай тэхнікі; толькі некалькі працэнтаў школаў маюць выхад у інтэрнэт. | Амаль усе школы забясьпечаны сучаснай ЭВТ,большасць мае выхад у інтэрнэт. Плянуецца да 2006 года ўсе школы падключыць да інтэрнэту. |
| Фінансаваньне школ | Зь дзяржаўнага бюджэту. Апошнім часам легалізуецца фінансавая й матэрыяльная дапамога школам шляхам дзейнасьці апякунскіх радаў. Бюджэт школы залежыць, у асноўным, ад колькасьці настаўнікаў. Падручнікі набываюцца за кошт бацькоў. Харчаваньне дзяцей фінансуецца недастаткова, шмат з гурткоў у пазашкольных установах зьяўляюцца платнымі. | Базавыя школы – са сродкаў мясцовага самакіраваньня, сярэднія – з дзяржбюджэту. Рамонт, газ і электразабесьпячэньне – за кошт муніцыпалітэту. Зарплата й сродкі навучаньня фінансуе Міністэрства праз рэгіянальныя ўлады. Бюджэт школы залежыць ад колькасьці вучняў. Падручнікі да 15 гадоў вучні атрымліваюць бясплатна. Фінансуецца харчаваньне дзяцей і заняткі ў пазашкольных установах. Школам істотна дапамагаюць розныя фонды й прадстаўнікі бізнэсу. |
| Падвышэньне кваліфікацыі настаўнікаў і кіраўнікоў школаў | Амаль манаполія дзяржавы, адбываецца ў АПА й абласны (Мінскім гарадскім ІПК); раз у пяць гадоў настаўнікі праходзяць курсы. Не вітаецца дзейнасьць недзяржаўных арганізацыяў па навучаньню пэдагогаў. Навучаньне, як правіла, бясплатнае – за кошт дзяржбюджэту. | Прыкладна ў аднолькавай ступені падвышэньнем кваліфікацыі займаюцца дзяржаўныя пэдагагічныя цэнтры й недзяржаўныя арганізацыі (раз у два гады першыя й другія праходзяць дзяржаўную акрэдытацыю). За навучаньне плацяць навучальныя ўстановы, у якіх працуюць настаўнікі (дырэктар школы вырашае, колькі сродкаў ён аддасьць на павышэньне кваліфікацыі пэдагогаў). Своесаблівымі цэнтрамі павышэньня кваліфікацыі становяцца 55 экспэрыментальных школаў. |
| Залежнасьць зарплаты пэдагогаў ад стажу й кваліфікацыйнай катэгорыі | Залежыць і ад стажу, і ад катэгорыі, але ў малой ступені. | Залежыць толькі ад стажу ў значнай ступені. |